РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ВЕРАСНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 181 (30569)

АДУКАЦЫЯ

## АСНОВЫ ПРАФЕСІЙ — СА ШКОЛЫ

### Чым заняць дзіця пасля ўрокаў



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

З пачаткам новага навучальнага года школьнікі традыцыйна акрамя школьных урокаў выбіраюць дадатковыя заняткі для самарэалізацыі, якія дазваляць з карысцю правесці вольны час. Не губляе сваёй папулярнасці ў дзяцей і падлеткаў мастацкі кірунак — выяўленчае мастацтва, музыка і спевы, тэатр. У апошнія гады ўсё большую папулярнасць, асабліва ў хлопцаў, набіраюць такія заняткі, як робататэхніка, прататыпаванне, праграмаванне, ментальная арыфметыка, вэб-тэхналогіі, інжынернае канструяванне і мадэляванне і радыёэлектроніка. Побач з традыцыйнымі аўта- і авіямадэляваннем цікавасць выклікаюць новыя кірункі, звязаныя са штучным інтэлектам, нейрасеткамі, вэб-распрацоўкай, графічным дызайнам, лазернымі тэхналогіямі, ландшафтнай архітэктурай. Пра магчымасці дадатковай адукацыі ў новым навучальным годзе расказалі спецыялісты.

СТАР. 8–9



У ПОШУКУ НОВЫХ БІЗНЕС-КАНТАКТАЎ 7




ДЗІЦЯЧЫЯ КНІГІ АД «ЗВЯЗДЫ» 15



ЧАЦВЁРТЫ МЕСЯЦ ЛЕТА? 16



+TV ПРАГРАМА

«НЯЎЛОЎНЫЯ МСЦІЎЦЫ»

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

СПАЖЫВЕЦ

## СВЕЖАЕ І ЯКАСНАЕ ПА ДАСТУПНАЙ ЦАНЕ

### У гэтыя выхадныя стартуе сезон сельскагаспадарчых кірмашоў

З 20 верасня ў сталіцы і Мінскай вобласці сёлета распачнуцца сезонныя сельскагаспадарчыя кірмашы, якія будуць праходзіць пераважна ў выхадныя. Традыцыйна тут можна будзе набыць для зімовых запасаў бульбу, садавіну і агародніну, ягады і мёд, а таксама мясныя далікатэсы і рыбу, малочную, кандытарскую і прадукцыю кулінарыі, прамысловыя тавары і вырабы рамеснікаў. Будзе арганізавана дапамога па дастаўцы набытай на кірмашах прадукцыі сацыяльна неабароненым катэгорыям грамадзян — ветэранам, адзінокім пажылым людзям, інвалідам, а таксама дастаўка да асабістага транспарту.



Фота БелТА.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

25181

# ДЫЯЛОГ АБ МІНУЛЫМ,

## Эксперты — аб вялікай размове ў Дзень народнага адзінства,




Вялікая размова, якая ў Дзень народнага адзінства адбылася ў Палацы Незалежнасці з ідэалагічным актывам, гістарычнай і экспертнай супольнасцю, не толькі застанецца ў памяці яе ўдзельнікаў, а яшчэ доўга будзе абмяркоўвацца ў грамадстве, бо шырокае кола пытанняў, якое закранаалася на сустрэчы, хвалюе кожнага жыхара нашай краіны. Як заўсёды, Прэзідэнт адказваў на пытанні з уласцівай яму шчырасцю і адкрытасцю. Закрытых тэм не было.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел звыш 50 чалавек, сярод якіх кіраўнікі дзяржаўных органаў, сродкаў масавай інфармацыі, гісторыкі, журналісты, палітолагі — лідары грамадскай думкі, да якіх прыслухоўваюцца. Кожны, хто хацеў, агучыў хвалюючае яго пытанне, уносіў прапановы і нават прасіў парады ў кіраўніка дзяржавы. Якія сэнсы вынеслі з сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з ідэалагічным актывам, гістарычнай і экспертнай супольнасцю, расказалі яе ўдзельнікі.

### «ТОЛЬКІ Ў АДЗІНСТВЕ — НАША СІЛА»




Як звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** усе мерапрыемствы, што адбываюцца ў нашай краіне, і ў цэлым атмасфера, якая пануе ў грамадстве, сведчыць: нашы людзі вельмі цэняць тое, што сёння маюць. «І мірную спакойную краіну, і тую сацыяльную падтрымку, якой няма ні ў адной іншай краіне, — канкрэтызавала яна. — Мы дакладна ўсвядомілі, што толькі ў адзінстве — наша сіла. Мы дакладна засвоілі, што ўрокі гісторыі павінны добра памятаць. І не проста памятаць, а аналізаваць, рабіць усё для таго, каб трагічныя старонкі ў гісторыі нашай краіны ніколі не паўтарыліся. Людзі павінны дакладна ўсведамляць, што ад кожнага з нас залежыць будучыня краіны. І калі мы хочам жыць на сваёй зямлі, мы павінны зрабіць усё для таго, каб наша краіна развівалася далей, каб мы былі адзіныя ў імкненні захаваць сваю краіну».



### «ДЗЯКУЮЧЫ КАНСАЛІДАЦЫІ МЫ РУХАЕМСЯ ДАЛЕЙ»

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** адзначыў, што ў Дзень народнага адзінства беларускі народ аддае даніну павагі гістарычнаму мінуламу, тым гераічным цяжкім гадам, дзякуючы якім нашы продкі выстаялі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднавілі народную гаспадарку ў пасляваенны перыяд і стварылі нашу краіну такой, якой яе бачым сёння. «З іншага боку, мы глядзім наперад, — звярнуў увагу спікер. — Дзякуючы адзінству, кансалідацыі грамадства рухаемся далей і вырашаем самыя складаныя эканамічныя задачы, праблемы, якія сёння ўзнікаюць у жыцці кожнага чалавека».

### «ВЫБУДОЎВАЕМ СІСТЭМУ КАШТОЎНАСЦЯЎ З АПОРАЙ НА ГІСТАРЫЧНЫ ВОПЫТ»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК** адзначыў, што ідэалогія — сістэма каштоўнасцяў, якая арганічна ўспрымаецца ўсім грамадствам. «Многія не разумеюць, у чым розніца паміж партыйнай ідэалогіяй і ідэалогіяй як сістэмай каштоўнасцяў грамадства, — заўважыў ён. — Тое, што мы завём ідэалогіяй, амерыканцы завуць амерыканскім ладам жыцця. Еўрапейцы называюць гэта еўрапейскімі каштоўнасцямі. Ёсць пэўны набор каштоўнасцяў, якія мы падзяляем, і тады можна казаць аб тым, што існуе ідэалагічна аднастайная тэрыторыя».

Па словах дэпутата, ідэалогія як сістэма каштоўнасцяў — не нуднае чытанне пад капірку, а тое, што рэалізоўваецца праз розныя праграмы, работу Усебеларускага народнага сходу, заканадаўчую практыку. «Глыбока памыляюцца тыя, хто думае, што ідэалогія — нешта выдуманае, — перакананы Ігар Марзалюк. — Насамрэч гэта якраз магчымасць тлумачыць людзям тыя рэчы, многія з якіх яны ўспрымаюць, падтрымліваюць. Таму ў нас такі ўзровень якасці жыцця, бо гэта звязана з нашымі фундаментальнымі каштоўнасцямі».

Ён дадаў, што ідэалогія — форма светапогляду. «А ўсялякі светапогляд — адказ на тры пытанні: адкуль мы, чаму мы такія і як нам развівацца, — канкрэтызаваў парламентарый. — Гэта ўсё адбываецца з апорай на гістарычны вопыт, на аснове чаго мы выбудоўваем сваю сістэму каштоўнасцяў».

Кажучы пра адзінства ў беларускім грамадстве, Ігар Марзалюк звярнуў увагу на тое, што яно цесна звязана з павагай да іншых людзей незалежна ад іх веравызнання або мовы, на якой размаўляюць. «Мы не дыскрымінуем чалавека з-за таго, што ў яго іншы разрэз вачэй, іншая мова або іншая рэлігія, — канстатаваў дэпутат. — Наадварот, мы даём магчымасць развівацца. БССР была ўнікальнай рэспублікай, асабліва ў 1920-х гадах: меліся чатыры дзяржаўныя мовы. Больш у Савецкім Саюзе такой не было нідзе і ні ў каго».

### «НАЙВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА МОЛАДЗІ — НЕ ДАПУСЦІЦЬ РАЗДЗЯЛЕННЯ ДЗЯРЖАВЫ»

**Першы сакратар ЦК БРСМ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** падкрэсліў, што





На гэтых фота – кульмінацыя святкавання Дня народнага адзінства. Па традыцыі ёй стаў Форум патрыятычных сіл,які яскрава паказаў, што Беларусь — гэта адзіная краіна, а беларусы — адзіная нацыя. І ўсіх нас аб'ядноўвае любоў да сваёй Радзімы.

# СЁННЯШНІМ І БУДУЧЫМ

**аб яе сэнсах і задачах**

найважнейшая задача маладога пакалення — ніколі больш не дапусціць раздзялення нашай дзяржавы.

«Мы гэтага і не дапусцім, — адзначыў ён. — Перакананы, што так думае цяперашняе пакаленне маладых патрыётаў, хлопцаў і дзяўчат, якія ўступаюць у ваенна-патрыятычныя клубы, якія дапамагаюць умацоўваць памяць, працуючы ў складзе студатрадаў на гістарычных аб'ектах. Такіх, як Нацыянальны гістарычны музей, Парк народнага адзінства, мемарыяльны комплекс «Хатынь», мемарыял «Брэсцкая крэпасць-герой». Яны дакладна ведаюць, што наша задача — умацаванне і будаўніцтва не толькі фізічных аб'ектаў. Вельмі важныя нашы сувязі адзінства, шматграннага паняцця, якое заключаецца не толькі ў пазнацы грамадзянства ў пашпарце, але і ў нашай нацыянальнай ідэнтычнасці. Мы, беларусы, мірныя людзі і адзіны народ».

## «ЗАЎСЁДЫ ПРЫТРЫМЛІВАЕМСЯ МІРАЛЮБІВАЙ ЛІНІІ»

**Дэкан факультэта журналістыкі БДУ, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** згадаў словы Прэзідэнта, які сказаў, што святы не нараджаюцца штучна: усё павінна выспець і ўсяму павінен быць свой час. «Паколькі Дзень народнага адзінства — яшчэ маладое свята, стаіць пытанне аб неабходнасці цэлага комплексу мерапрыемстваў па ўкараненні гэтага свята, каб яно стала сапраўды ўсенародным», — адзначыў Аляксей Бяляеў.

У якасці прыкладу, што любое падобнае рашэнне павінна выспець, дэкан факультэта журналістыкі БДУ нагадаў: падчас размовы ў Палацы Незалежнасці ўзнімалася пытанне аб стварэнні на месцы канцэнтрацыйнага лагера «Бяроза-Картузская» музея нацыянальнага маштабу. «Пытанне аб польскай акупацыі Заходняй Беларусі ў 1920-1930-х гадах — з таго разраду, што гістарычна мы ведаем гэтую падзею, але з палітычнага пункту гледжання ніколі не спрабавалі на гэтым зарабляць пэўныя ачкі, — канстатаваў ён. — Бо мы не жадаем сварыцца, заўсёды прытрымліваемся міралюбівай лініі, выбудоўвання канструктыўных адносін з суседзямі. Але, улічваючы пазіцыю той жа Польшчы, якая ні на які канструктыў не ідзе, а робіць усё для таго, каб абвастраць адносіны, вядома, нам трэба і да нашых грамадзян даводзіць, што ёсць пытанні да гэтай дзяржавы».

Аляксей Бяляеў канкрэтызаваў, што менавіта праз Дзень народнага адзінства сёння можна ўзняць пытанні, звязаныя з несправядлівым Рыжскім мірным дагаворам 1921 года, які прывёў палову Беларусі амаль на два дзесяцігоддзі пад уладу людзей, якія тварылі на нашай зямлі этнацыд.

## «ЁСЦЬ ТЫЯ, ХТО ХОЧА ПЭЎНЫХ ВЯЛІКІХ СЭНСАЎ, ЗРАЗУМЕЛЫХ МЭТ»

На думку **навуковага супрацоўніка Інстытута філасофіі НАН Беларусі Аляксея ДЗЕРМАНТА**, часам у пытанні ідэалогіі не хапае зваротнай сувязі. «Мы прапаноўваем пэўныя канцэпты. Пытанне — як на гэта рэагуюць людзі, — удакладніў ён. — Перш за ўсё маладыя. З аднаго боку, нам здаецца, што ім трэба нешта максімальна прагматычнае — грошы, работа, жыллё. З іншага боку, ёсць тыя, хто хоча пэўных вялікіх сэнсаў, зразумелых мэт: куды мы ідзём? з кім мы ідзём? як сябе адчуваем у свеце? што такое быць беларусам? што такое беларуская нацыя на сучасным этапе?»

Па словах эксперта, не забываючы пра рэальныя патрэбы людзей, неабходна даносіць ім ідэалагічныя сэнсы. «Гэты баланс трэба захаваць, — лічыць Аляксей Дзермант. — Пытанне абмяркоўвалася і падчас вялікай размовы з кіраўніком дзяржавы. Прэзідэнт выказваў свой пункт гледжання. Мы пачулі канкрэтныя прапановы. У выніку гэта трэба прааналізаваць і перанесці ў рэальную практыку».

## «МЫ НЕ ПАВІННЫ ШТУЧНА НАВЯЗВАЦЬ ПЭЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ І КАШТОЎНАСЦІ»

**Старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый Вадзім БАРАВІК** звярнуў увагу на тое, што Прэзідэнт справядліва падкрэсліў: і нацыянальная ідэя, і наш падыход да фарміравання ідэалогіі павінны будавацца ў канктэксце нацыянальнай дыскусіі. «Не трэба штучна навязваць пэўныя прынцыпы і каштоўнасці грамадству, — канкрэтызаваў ён. — Гэта не значыць, што ідэалагічны апарат у гэтым плане не працуе або нацыянальны лідар не вядзе краіну. У нас ёсць шлях, ёсць разуменне таго, як мы развіваем эканоміку, як выбудоўваем стратэгічныя адносіны, але сэнсы фарміруюцца ў нас цалкам дэмакратычным чынам. Гэта грамадская дыскусія, аналіз гістарычнага шляху, аналіз сучасных выклікаў. У гэтым канктэксце будзем накіроўваць нашу работу ў ідэалагічным плане».

Па меркаванні эксперта, нацыянальную ідэю нельга штучна навязаць. «Яе можна толькі сфарміраваць, абапіраючыся на шырокую грамадскую дыскусію», — канстатаваў ён.

Кажучы аб інфармацыйных укідах, якія грунтуюцца на тым, што ў Беларусі з пазіцыі канфрантацыі ўзаемадзейнічаюць з Польшчай, Вадзім Баравік падкрэсліў, што гэта хлусня. «Мы чулі ад Прэзідэнта, які кажа аб тым, што нават пэўныя праекты, фільмы дакументальныя патрэбна здымаць з пункту гледжання не абвастрэння адносін з нашымі суседзямі, а кіравання здаровым сэнсам. Варта заклікаць нашых суседзяў кіравацца менавіта тым жа: здаровым падыходам, дыялогам, знаходжаннем пунктаў судакранання, — праінфармаваў эксперт. — А праўду трэба казаць, калі былі такія падзеі ў гісторыі нашай краіны, калі наш народ пацярпеў або мы былі пазбаўлены магчымасці на сваёй зямлі прымаць рашэнні. Пра гэта трэба гаварыць. Мы гэтага хаваць не будзем. Аднак мы не зацікаўлены ў эскалацыі адносін, не зацікаўлены ў канфлікце. Беларусы хочуць мірна суіснаваць, узаемадзейнічаць, жыць мірна з нашымі суседзямі, гандляваць і працаваць. Галоўнае, каб і з іх боку быў такі ж падыход».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**







ВА ЎРАДЗЕ

## КАБ БЫЛА ЖЫВОЙ І САПРАЎДНАЙ

### У Саўміне разгледзелі Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны

Рост дабрабыту грамадзян і забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве. Гэта аснова праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады, якую ў гэты чацвер абмяркоўвалі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

## ПРАГРАМА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ НЕ ПАВІННА ЖЫЦЬ СВАІМ ЖЫЦЦЁМ



«Гэта найважнейшы прагнозны дакумент, які вызначае стратэгію развіцця краіны на сярэднетэрміновую перспектыву. Канцэпцыю праграмы кіраўнік дзяржавы адобрыў яшчэ ў маі, а Міністэрству эканомікі была пастаўлена задача на яе аснове падрыхтаваць выверany і эфектыўны дакумент, які стане асновай для паспяховага развіцця Беларусі на наступныя пяць гадоў, — пачынаючы пасяджэнне, адзначыў **Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН**.

**— Каб праграма была «жывой і сапраўднай», як даручаў кіраўнік дзяржавы, патрабавалася ўдасканаліць падыходы да яе выканання, забяспечыўшы стапрацэнтную спалучанасць з інструментамі яе рэалізацыі: дзяржаўнымі, галіновымі і рэгіянальнымі праграмамі».**

Кіраўнік Урада падкрэсліў, што Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны не павінна жыць сваім жыццём. Усе інструменты і рэсурсы, якімі валодае Урад, павінны быць падпарадкаваны яе выкананню. «Для гэтага ў падпраграмных дакументах павінна быць вызначана этапнасць выканання задач, устаноўлены прамежкавыя мэты. Менавіта па іх будзе праводзіцца штогадовая ацэнка работы кіраўнікоў», — акцэнтаваў Аляксандр Турчын.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# КАБ БЫЛА ЖЫВОЙ І САПРАЎДНАЙ



*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу ўдзельнікаў пасяджэння на тое, што пяцігадовая праграма з'яўляецца праграмай развіцця дзяржавы:

> **«Не праграмай будаўніцтва дарог або квадратных метраў жылля, а комплексным дакументам, які простай і зразумелай мовай дасць адказы на пытанні, як будзе развівацца эканоміка нашай краіны ў найбліжэйшыя пяць гадоў, якія прыярытэтныя кірункі развіцця вызначаны і, самае галоўнае, як усё гэта паўплывае на якасць жыцця нашых грамадзян у любым кутку краіны».**

## АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ, ЯКАСНЫЯ ДАРОГІ, ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ РЭАЛЬНАГА СЕКТАРА

Асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026—2030 гады разглядалі паўгода таму, яшчэ ў красавіку, у канцэпцыі адпаведнай праграмы, нагадаў у размове з журналістамі **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР:** «У адпаведнасці з Законам аб дзяржпраграмаванні, канцэпцыя была адобрана кіраўніком дзяржавы, яна стала базавай для таго, каб мы распрацавалі праграму», — падкрэсліў міністр.



Юрый Чабатар дадаў, што ключавыя моманты, якія былі закладзеныя яшчэ тады, засталіся нязменнымі.

> **«Гэта пяць асноўных прыярытэтаў і сем кірункаў, у якія мы ўнеслі ўсе асноўныя запыты грамадства, даручэнні кіраўніка дзяржавы, бягучыя праблемныя моманты, якія трэба будзе вырашыць у наступныя пяць гадоў. Сярод пяці прыярытэтаў — арэнднае жыллё, якасныя дарогі, пытанні развіцця рэальнага сектара — гэта пытанні цыфравізацыі і тэхналагічнасці, а таксама моцныя рэгіёны», — пералічыў ён.**

Акрамя таго, важным прыярытэтам вылучаны турызм. На гэта накіраваны апублікаваны нядаўна Указ Прэзідэнта № 329 «Аб удасканаленні дзяржаўнага кіравання ў сферы турызму», згодна з якім Нацыянальнае агенцтва па турызме перадаецца ў падпарадкаванне Савету Міністраў. Паводле слоў Юрыя Чабатара, параметры ўжо зразумелыя — гэта галіна ў канцы пяцігодкі павінна займаць 4,5 % у ВУП.

На пасяджэнні разглядаўся таксама комплекс дакументаў, якія забяспечваюць выкананне сацыяльна-эканамічных паказчыкаў будучай пяцігодкі, сказаў міністр. У яго ўваходзяць 19 дзяржаўных праграм, 17 галіновых, больш за 30 навукова-тэхнічных і 7 рэгіянальных. «Гэта ўсё фарміруе аблічча і каркас выканання пяцігодкі на 2026—2030 гады. Мы рэалізавалі задуманае намі ў красавіку — прынцып вертыкалізацыі, пры якім усе паказчыкі і задачы будучай пяцігодкі каскадаваныя ўніз на адпаведныя праграмы і адказных міністраў. Такім чынам, ужо цяпер зразумела, хто і што будзе выконваць», — звярнуў увагу ён.

Асобныя кірункі ўжо рэалізуюцца. Напрыклад, па арэндным жыллі створана заканадаўчая база, якая дазваляе людзям разумець правілы выкупу. Прыняты ўказ аб крэдытаванні прадпрыемстваў для стварэння арэнднага жыллёвага фонду.

## З НАСТУПНАГА ГОДА ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЗМОГУЦЬ УЗЯЦЬ КРЭДЫТ ДЛЯ ЎКАРАНЕННЯ РОБАТАТЭХНІКІ

Драйверамі на наступную пяцігодку стануць новыя кірункі эканомікі і галін, на якія арыентуюцца рэгулятары. Юрый Чабатар прывёў прыклады такіх кірункаў: стварэнне ў Беларусі робататэхнічнай галіны з падтрымкай укаранення рабатызацыі і аўтаматызацыі на прадпрыемствах, а таксама выкарыстанне мясцовай сыравіны — развіццё дрэваапрацоўчай прамысловасці. Па словах міністра, гэтыя кірункі актуальныя і ўжо прадугледжаны ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця.

«Мы прадугледзелі з наступнага года крэдытны прадукт для прадпрыемстваў для ўкаранення ў сябе робататэхнікі, рабатызацыі і аўтаматызацыі сваіх працэсаў. У дрэваапрацоўцы — акцэнт на выкарыстанне мясцовай сыравіны, павелічэнне ў 1,2 раза мэблевых вытворчасцяў. Для гэтага, дарэчы, мы таксама спецыяльны прадукт прадугледзелі: з наступнага года крэдыт пад 6 % на 7 гадоў для новых прадпрыемстваў у гэтай галіне», — адзначыў Юрый Чабатар.

Кіраўнік эканамічнага ведамства яшчэ раз падкрэсліў: асноўны кантэкст Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026—2030 гады — запыты грамадства і даручэнні Прэзідэнта:

> **«Аб'яўлена пяцігодка якасці — адпаведна, накіроўваем намаганні на стварэнне якасных умоў для працы і жыцця грамадзян, рэальнага сектара эканомікі. Калі ўсё гэта выканаем, у нас будуць высокія паказчыкі па экспарце, росце заработнай платы, ВУП».**

Па выніках разгляду ва Урадзе праграма будзе вынесена на Усебеларускі народны сход.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **филиала «Автобусный парк № 4» ОАО «Миноблавтотранс»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

- **здание производственного корпуса с инв. № 633/С-10378 общ. пл. 726,6 кв. м, адрес: Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, ул. Интернациональная, 11/8,**
- **склад № 1 с инв. № 633/С-10371 общ. пл. 314,8 кв. м, адрес: Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, ул. Интернациональная, 11/10,**
- **склад № 2 с инв. № 633/С-10372 общ. пл. 188,3 кв. м, адрес: Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, ул. Интернациональная, 11/9 (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624050100001002347 (право аренды по 25.02.2124) площадью 0,3513 га по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, ул. Интернациональная, 11А.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения (0,3513 га).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 224 280,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 22 428,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта возможна с рассрочкой платежа до 6 (шести) месяцев равными долями в течение срока, на который предоставлена рассрочка, начиная с месяца в котором должен осуществляться первоначальный платеж в соответствии с договором купли – продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **21.10.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 323-35-21.**

УНН 601070223



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ОАО «Премьерлизинг», 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 103, пом. 17 (14-й этаж)

| № лот | Предмет аукциона | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. | Дата и время проведения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение торгового центра** (торговое помещение), инв. номер 300/D-6524, общая площадь – 1275,4 кв. м, по адресу: г. Гомель, ул. Царикова, 5А-1 | 1 224 000,00 (снижена на 40 %) | 61 200,00 | 30.09.2025 г. 13.00 |

**Обременение: Аренда.** Подробная информация на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by и у Продавца.
**Порядок ознакомления с предметом торгов** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Павел Владимирович, +375 (29) 189-29-50

| | |
|---|---|
| **Место проведения аукциона** | г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **29.09.2025** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (4 % от цены продажи лота) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2025 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел. +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ**
**в форме очного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 130-16Б/2018 в экономическом суде Гомельской области**

**Организатор аукциона:** ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by

**Собственник имущества:** ОАО «Гомельский жировой комбинат», УНП 400078303, 246021, Гомельская область, г. Гомель, ул. Ильича, 4

**Продавец имущества**: ООО «СтанИБор», УНП 491343813, 246017, Гомельская обл., г. Гомель, а/я № 14

| № | Наименование | ОБЩАЯ нач. цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1-18 | Дебиторская задолженность на общую сумму 4 336 867,72 бел. руб. Разбита на 18 отдельных лотов | 3 903 180,95 |

Размер задатка – 10 % от начальной цены лота.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота

Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа ООО «Индустрия Инноваций».
Сведения о предмете и порядке проведения, в том числе об оформлении участия в аукционе, определении лица, выигравшего аукцион, а также информация о полном составе имущества и его начальной цене размещены на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» https://iin.by.
**Аукцион состоится 21.10.2025 по адресу: 220002, г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, начало 11.00. Время приема заявок: с 19.09.2025 09.00 до 20.10.2025 г. 17.00**

**Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: a.korotkaya@iin.by**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевский мясокомбинат»**
(г. Могилев, пр-т Димитрова, 11)

**Электронные торги состоятся 20.10.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1: Автомобиль GEELY EMGRAND 7,**
тип кузова – седан, кузов (рама) № Y4K8824S5KB000623, р/з – 7066 II-6, г. в. – 2019.

**Начальная цена продажи: 24 120,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 2 412,00 бел. руб.**

**Местонахождение: г. Могилев, пр-т Димитрова, 11.**

Р/с для перечисления задатка: BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Срок подачи документов для участия в торгах: по 16.10.2025 до 12.00.

Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения лица, выигравшего торги, и порядок оплаты вознаграждения содержится в информации о проведении торгов, опубликованной на сайте Организатора торгов GOSTORG.BY.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 дня до даты торгов. Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней с даты торгов.

Извещение также размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, и на торговой площадке GOSTORG.BY.

Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
**по поручению открытого акционерного общества «Весейский Покров»**
(продавец, местонахождение: 223631, Минская область, Слуцкий район, аг. Весея, ул. Покровская, д. 3)
**проводит открытый аукцион**

по продаже **комбайна свеклоуборочного самоходного HOLMER TERRA DOS T3,**

**г. в. 2010, заводской № 2853, регистрационный № БШ 8580, инвентарный № 2048, расположенного по адресу: Слуцкий р-н, а/г Весея.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 189 600,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 18 960,00 бел. руб.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: **au.nca.by, rlt.by.**

Электронные торги состоятся **23.10.2025** в **10.00.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.10.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра 8 (029) 577 65 42.**

УНН 600043258


КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

# ЗАКОНЫ АД ЖЫЦЦЯ І МІЖНАРОДНЫЯ

## У Савеце Рэспублікі пабывалі супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі

**Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адзінай у краіне бібліятэкай, якая была створана спецыяльна для абслугоўвання органаў дзяржаўнага кіравання. Аднак даступная яна і для большасці жыхароў краіны: абслугоўвацца тут можа кожны паўналетні чытач. Супрацоўнікі ўстановы прымаюць удзел у падрыхтоўцы заканадаўчых і іншых дакументаў, якія рэгламентуюць бібліятэчна-інфармацыйную дзейнасць у рэспубліцы.**

Будучы ў эпіцэнтры заканадаўчай дзейнасці краіны, супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі азнаёміліся з дзейнасцю і гісторыяй Савета Рэспублікі: для гасцей правялі экскурсію па музеі і зале пасяджэнняў.


Фота ТГ-канала Савета Рэспублікі.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** расказала гасцям і аб фармаце работы сенатараў, іх колькасным складзе. Асаблівую ўвагу спікер удзяліла дзейнасці Савета Рэспублікі.

Асноўны кірунак — работа над законапраектамі. «У дадзены момант у нашым партфелі знаходзіцца 24 законапраекты, якія найперш разглядаюцца ў Палаце прадстаўнікоў, — праінфармавала Наталля Качанава. — Але ў рабоце над законапраектамі члены Савета Рэспублікі падключаюцца на самым пачатковым этапе».

Не менш важнай задачай, па словах спікера, з'яўляецца работа з людзьмі. «Гэта нам дапамагае ў рабоце над законапраектамі: наколькі яны актуальныя, патрэбны на сучасным этапе, — патлумачыла Наталля Качанава. — Прэзідэнт нам заўсёды кажа — законы павінны ісці ад жыцця. І, вядома, прымацца так, каб яны на працягу пэўнага часу працавалі і не трэба было перыядычна ўносіць у іх змяненні і дапаўненні. Але жыццё часам гэтага патрабуе».

Спікер праінфармавала, што формы работы з грамадзянамі ў найбліжэйшы час будуць удасканалены.

Асаблівы акцэнт Старшыня Савета Рэспублікі зрабіла на міжнароднай дзейнасці парламентарыяў.

Абмяркоўваліся падчас сустрэчы і пытанні маладзёжнай палітыкі, сямейных каштоўнасцяў — гэта заўсёды ў полі зроку парламентарыяў. Рэзюмуючы, Наталля Качанава падкрэсліла, што для членаў Савета Рэспублікі сустрэчы з працоўнымі калектывамі, моладдзю вельмі каштоўныя.

Як падзялілася па выніках сустрэчы **загадчык аддзела інфармацыйных рэсурсаў Прэзідэнцкай бібліятэкі Ірына АНДРУШЧАНКА**, наведванне такіх знакавых месцаў, якім з'яўляецца Савет Рэспублікі, прыбліжае кожнага грамадзяніна да дзяржаўнага кіравання, разумення працэсаў, якія адбываюцца ў краіне. Па яе словах, такія мерапрыемствы яднаюць уладу з народам.

**Вераніка КАНЮТА.**

УРАЖАННІ

# ВЫДАТНЫ ПАДАРУНАК ДА ЮБІЛЕЮ

## У рэзідэнцыю Прэзідэнта завіталі работнікі прадпрыемства «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка»

**У Палацы Незалежнасці 18 верасня правялі экскурсію, на якой пабываў калектыў Рэспубліканскага даччынага ўнітарнага прадпрыемства па забеспячэнні нафтапрадуктамі «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка». Большасць з гасцей тут упершыню і лічаць запрашэнне наведаць галоўную афіцыйную пляцоўку краіны з нагоды 50-годдзя ўтварэння прадпрыемства, а таксама да Дня работніка нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці сімвалічным падарункам.**


Фота БелТА.

Пачалася экскурсія па традыцыі ў Зале ўрачыстых цырымоній. Тут расказвалі пра гісторыю стварэння палаца. Вядома, што аб'ектаў такога маштабу ў нашай краіне раней не існавала. Прэзідэнт патрабаваў, каб Палац Незалежнасці быў пабудаваны беларускімі майстрамі і пераважна з беларускіх матэрыялаў. Сваім вопытам па ўзвядзенні такіх пляцовак, безумоўна, з нашымі спецыялістамі дзяліліся замежныя калегі.

У кароткія тэрміны палац быў пабудаваны, а ў кастрычніку 2013-га адчыніў свае дзверы для першых высокіх гасцей, а некалькі гадоў таму — і для звычайных беларусаў.

Падчас экскурсій госці натхняліся ўбачаным, рабілі фота- і відэасесіі, дзяліліся ўражаннямі. Асабліва прысутных уразіў той факт, што пераважна ўсё ў палацы — айчыннае. Зазірнулі экскурсанты ў гістарычныя памяшканні, напрыклад у знакамітую Зялёную залу — менавіта там праходзіў перагаворны марафон «нармандскай чацвёркі». Убачылі і палітычную гісторыю нашай краіны ў фотаздымках. Азнаёміліся з падарункамі ад лідараў замежных краін.

Наведванне Палаца Незалежнасці — узнагарода для найлепшых работнікаў прадпрыемства за адданасць сваёй справе, падзялілася меркаваннем **начальнік аддзела рознічнага гандлю Тацццяна ТУЗАВА:** «Варта адчуць атмасферу, энергетыку гэтага месца. Калегі, упэўнена, будуць дзяліцца ўражаннямі ад убачанага са сваякамі, знаёмымі. Падзяку за экскурсію хацелася б выказаць кіраўніку дзяржавы, Аляксандру Рыгоравічу, за тое, што ў нас ёсць такі здабытак народа, — рэзідэнцыя Прэзідэнта. А яшчэ і за тое, што кожны чалавек, які працуе на карысць Беларусі, можа наведаць палац».

У захапленні ад экскурсіі засталася таксама **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Вікторыя НАЗАРАНКА.** Па словах жанчыны, праведзеную работу беларускіх спецыялістаў над будынкам нельга не ацаніць па заслугах: «Ганаруся суайчыннікамі. Ад убачанага мурашкі па скуры. Больш за ўсё ўразіла мастацкая выстаўка на першым паверсе».

Старшыня Маладзёжнага савета прадпрыемства Арцём ЗІМА пабываў на галоўнай афіцыйнай пляцоўцы краіны ўпершыню. «Маштаб палаца ўражвае, — расказаў малады чалавек. — Праходзіў па залах і адчуваў асаблівую адказнасць, паколькі разумею, што тут праходзяць сустрэчы высокіх гасцей, вырашаюцца найважнейшыя пытанні. Эмоцыі перапаўняюць. На маю думку, пабываць у рэзідэнцыі Прэзідэнта варта кожнаму беларусу».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# АДЗІНЫЯ Ў АДСТОЙВАННІ СУВЕРЭНІТЭТУ І СУПРАЦЬДЗЕЯННІ ВЫКЛІКАМ

**У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі ролю палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у забеспячэнні народнага адзінства**

Пастаянная камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, якая ініцыіравала правядзенне тэматычнага круглага стала, планамерна і сістэмна вядзе работу па вывучэнні стану і перспектыў заканадаўчай базы. Што датычыцца грамадска-палітычнай сферы, якая ўваходзіць у кампетэнцыю камісіі, апошнія карэкціроўкі ў гэтай галіне ўступілі ў сілу ў 2023 годзе, калі быў прыняты Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці».

Аб эфектыўнасці заканадаўчых рашэнняў, якія не толькі актывізавалі работу палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, а далі ім новы імпульс для далейшага развіцця, а таксама ролі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у забеспячэнні народнага адзінства, што з'яўляецца актуальным у развіццё сустрэчы кіраўніка дзяржавы з ідэалагічным актывам, гістарычнай і экспертнай супольнасцю, гаварылі падчас круглага стала.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Мікалай БУЗІН**, заканатворчая дзейнасць — складаны працэс, які патрабуе пастаяннай данастройкі. «Заканадаўчыя рашэнні, якія рэгламентуюць дзейнасць партый, грамадскіх аб'яднанняў, уступілі ў сілу крыху больш за два гады таму, але за гэты час адбылося шэраг падзей унутры нашай дзяржавы, вакол яе, — удакладніў ён. — Сустрэча — гэта свайго роду маніторынг стану нашага грамадства, партыйнага будаўніцтва на дадзены момант».

Каб высвеліць, што неабходна сучаснаму грамадству, а адпаведна, якіх заканадаўчых рашэнняў чакаць у перспектыве, абмяркоўвалі падчас круглага стала. «Заканадаўства павінна забяспечваць вырашэнне найгалоўнейшай задачы — паляпшэнне жыцця грамадзян, — канкрэтызаваў Мікалай Бузін. — І ўсе працэсы ў рамках дзейнасці ўлады накіраваны менавіта на гэта».

Як звярнуў увагу **першы сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Сяргей СЫРАНКОЎ**, Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» з'яўляецца своечасовым дакументам, калі пытанні партыйнага будаўніцтва выйшлі на перадавыя пазіцыі. «Дакумент быў накіраваны на тое, каб у тым ліку адсекчы пэўныя спекулятыўныя элементы на палітычным полі краіны, — канстатаваў ён. — Тыя прадуманыя патрабаванні да дзейнасці палітычных партый (перарэгістрацыя, наяўнасць арганізацыйнай структуры, колькасны склад, поўная адсутнасць фінансавання з-за мяжы і інш.) сталі дастаткова сур'ёзнымі перашкодамі для многіх нашых «калег» па партыйным руху. У выніку ў краіне дзейнічаюць патрыятычныя, ідэалагічна накіраваныя і адказныя за лёс народа партыі».

Ад імя ўсіх камуністаў краіны Сяргей Сыранкоў запэўніў, што, нягледзячы на нейкія ідэйныя і праграмныя рознагалоссі, у палітычных партый — поўнае адзінства ў пытаннях адстойвання суверэнітэту, незалежнасці нашай краіны, супрацьдзеяння выклікам і пагрозам. «У гэтай сувязі мы выступаем адзіным фронтам, мы маналітныя, і, як бы камусьці ні хацелася, нас нікому не раздзяліць», — падкрэсліў лідар партыі.

Па словах **генеральнага сакратара грамадскага аб'яднання «Беларускі Чырвоны Крыж», намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Дзмітрыя ШАЎЦОВА**, усе партыі і грамадскія аб'яднанні павінны быць гатовымі супрацьстаяць любому выкліку, любой пагрозе. «2020 год нас многаму навучыў, — заўважыў ён. — Невыпадкова ў нас з'явіўся Дзень народнага адзінства, няпроста так яму нададзены статус аднаго з найважнейшых свят. Ёсць разуменне: пакуль мы адзіныя, мы можам супрацьстаяць шматлікім пагрозам».

Дэпутат пагаджаецца са словамі беларускага лідара, які сказаў, што, каб пазбегнуць падобных выклікаў у будучыні, трэба забяспечыць устойлівую эканамічную дзейнасць. «Мы павінны працаваць, — удакладніў Дзмітрый Шаўцоў. — Кіраўнік дзяржавы прыводзіў у прыклад, як працуюць у той жа Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Нам ёсць да чаго імкнуцца. Так, мы шмат чаго дасягнулі, але разам з тым нам трэба рухацца наперад. У гэтым плане вельмі важная кансалідацыя грамадства, як і ідэалагічная асвета».

**Вераніка КАНЮТА.**

ПА СУТНАСЦІ

# МЫ РАЗАМ!



Нішто так не кансалідуе краіну, як агульныя пагрозы і агульныя ідэі. Цяпер — момант ісціны. Мы пераходзім на новы этап развіцця краіны. І тут ёсць вельмі важная сфера — сфера паразумення паміж дзяржавай і грамадскасцю. Гаворка не пра калектыўны дагавор. Пра паразуменне. Адзінства можна забяспечыць згуртаванасцю ўлады і грамадства. Нас спрабуюць збіць з панталыку: маўляў, 17 верасня — савецкі перажытак. Так, падзеі з савецкіх часоў. Але без патэтыкі — краіна, нашы землі насамрэч былі падзелены — па-жываму. І прычына — у войнах, што, нібы страшэнныя хмары, засцілалі беларусам сонца.

Дарэчы, шмат «ідэалагічных мін» цяпер падымаецца з гістарычных пластоў. Але прыйшоў час гістарычнай праўды. Варта і надалей добраўпарадкоўваць краіну для людзей. А гэта можна рабіць толькі талакой, разам.

І Дзень народнага адзінства значна шырэйшы і глыбейшы, чым збавенне ад асадніка, пастарункаў, Бярозы-Картузскай і сціранне граніцы каля Негарэлага. Гэта адзінства нацыянальнага духу. Адказ захопнікам усіх часоў і ўсяму свету: мы — адзіныя. І дата 17 верасня ўмяшчае ў сябе змаганне беларусаў супраць крыжакоў, Карла XII, Напалеона альбо Гітлера. Так, усенародная барацьба падчас гітлераўскай акупацыі азначала толькі адно — наша адзінства, а ў адзіным гістарычным кантэксце польскі прыгнёт — не штосьці там метафарычнае, а цалкам канкрэтнае. Высякалі лясы Белавежжа, здзекаваліся з нашых людзей. Мы былі «пся крэў». Мізэрная колькасць дарог, прадпрыемстваў, школ у параўнанні з «глыбіннай Польшчай» сведчыць аб адным: «Крэсы Усходнія» — звычайная калонія.

Гэта гісторыя нашага народа. Паншчыну Пілсудкага памятаюць нават дрэвы, што растуць уздоўж нашых дарог. Здавалася б, усё, цяпер іншы час. Не. Нават нашу гісторыю, нашу культуру, нашу мову выкарыстоўваюць, каб зноў нас падзяліць. Уяўляеце, існаванне ўсёй апазіцыйнай махіны, яе прапагандысцкай хеўры мае адну місію — вярнуцца да тых самых «Крэсаў Усходніх». І праз закрыццё граніц перад 17 верасня згадваюцца гістарычныя паралелі.

Толькі наша ўнутраная стабільнасць дазволіць нам выстаяць, каб упэўнена рушыць наперад. Беларусы — нацыя хлебаробаў. І мы заўсёды разам: і падчас сяўбы, і калі збіраем багаты ўраджай, вырашчаны мазолістымі рукамі. І сваіх у бядзе не пакідаем, як было ўвосень 1939-га. Трымацца і развівацца нам дапамагае наша адзінства. Мы разам!

**Яўген ПУСТАВОЙ.**


# ПРАЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**по объекту «Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».**

***Жилой дом № 12 по ГП***

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «Реторсия Трейд» зарегистрировано Минским горисполкомом 01.10.2010 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 691310944.

Местонахождение: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1510 (кабинет 2). Тел. +375 (29) 177-00-22.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник–пятница с 9.00 до 19.00, суббота с 10.00 до 16.00, воскресенье – выходной. Тел. +375 (29) 177-00-22.

**Реализованные проекты:** нет.

**Информация о проекте:**

**Цель строительства** – строительство «Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».

Срок реализации проекта – 36 месяцев.

Ориентировочный срок ввода дома № 12 по ГП – 3 квартал 2027 г.

**Застройщиком получены:**

- решение Минского районного исполнительного комитета № 987 от 04.11.2021 г. о предоставлении земельного участка;
- решение Минского районного исполнительного комитета № 9698 от 02.09.2024 о разрешении на строительство;
- решение Минского районного исполнительного комитета № 1844 от 24.02.2025 о разрешении на строительство;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновении права на него № 600/1854-1202 от 11.10.2021 площадью 8.2293 га;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновении права на него № 600/182-14261 от 06.12.2021 площадью 7.7247 га;
- заключение государственной экспертизы № 512-15/24 от 27.09.2024 (положительное);
- заключение государственной экспертизы № 690-15/23 от 29.09.2023 (положительное);
- извещение о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора № 1-111И-592/24 от 09.09.2024;
- извещение о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора № 1-111Ж-188/25 от 18.04.2025;
- договор строительного подряда № 02/04-25-12 от 02.04.2025;

**Информация об объекте:**

Жилая застройка расположена в границах района д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области, расположенной с запада от г. Минска за Минской кольцевой автомобильной дорогой, ограничена с юга – существующей магистралью М6, с севера – существующей застройкой, с запада – существующей улицей Центральной, с востока – территорией пахотных земель. На территории жилого района предполагается размещение жилых зданий, имеющих различную этажность 2-7 этажей, многофункционального центра, двух встроенных детских садов, двух паркингов, а также размещение зданий и сооружений инженерного назначения: КНС, КТПБ, РТПБ, ШРП, котельной, очистных сооружений дождевых стоков.

Проектом благоустройства жилого района предусматривается обустройство набережной и русла р. Качинка, устройство шумозащитного экрана, устройство ограждения жилого района, оборудование системами видеонаблюдения и доступа на территорию.

Обустройство дворовых территорий предусматривается комплексное на группу жилых домов, велопарковки и велобоксы, детские игровые площадки, спортивные площадки, малые архитектурные формы. Проектом озеленения предусмотрена посадка декоративных деревьев и кустарников, устройство газона.

Многоквартирный жилой дом № 12 по генеральному плану запроектирован 3-секционным, 6-7-этажным, с техподпольем и плоской рулонной кровлей. В доме запроектированы 164 квартир общей площадью от 34 до 82 кв. м.

Наружные стены здания из блоков ячеистого бетона, из монолитного железобетона со сплошным утеплением минераловатными плитами, внутренние стены – из монолитного железобетона, перегородки – из блоков ячеистого бетона, кирпичные; перегородки межквартирные – сдвоенные из блоков ячеистого бетона с заполнением зазора минераловатными плитами.

В квартирах выполнена штукатурка стен, цементно-песчаная стяжка, розетка для электроплиты, установка унитаза в с/у, установка оптической розетки.

Система отопления квартир – двухтрубная горизонтальная с поквартирным учетом тепла. Радиаторы отопления – стальные панельные со встроенным терморегулирующим клапаном и нижним подключением.

Оконные блоки – ПВХ-профиль, заполнение – двухкамерные стеклопакеты, оборудованы детскими замками безопасности, в окнах с пониженной подоконной частью глухое заполнение из многослойного безопасного стекла на высоту не менее 1,1 м от пола. Дверные блоки – деревянные. Остекление балконов – профиль ПВХ, оборудованы детскими замками безопасности, нижняя часть глухая из многослойного безопасного стекла на высоту не менее 1,1 м от пола. В каждой секции запроектирован 1 лифт, кабина проходная.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности после ввода в эксплуатацию жилого дома и передачи дольщикам объектов долевого строительства, входят: помещения инженерного назначения; межквартирные тамбуры, лестничные клетки, лифтовые холлы, вестибюли, колясочные, помещения уличного и уборочного инвентаря, лифты, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, объекты инженерно-транспортной инфраструктуры и благоустройства жилого района.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 12 по генплану предлагаются:

**3 (три)** однокомнатные квартиры **площадью 34-35 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 440 до 5 800 белорусских рублей;**

**4 (четыре)** однокомнатные квартиры площадью **40-44 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5280 до 5 640 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатная квартира площадью **53-54 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 184 до 5 544 белорусских рублей;**

**8 (восемь)** двухкомнатные квартиры площадью **62-64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 704 до 5 096 белорусских рублей;**

**3 (три)** двухкомнатные квартиры площадью **81-82 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 544 до 4 904 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн-пт с 9.00 до 19.00, сб с 10.00 до 16.00, вс – выходной либо на сайте grand-village.by.

Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 29.09.2025 г.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# У ПОШУКУ НОВЫХ БІЗНЕС-КАНТАКТАЎ ДАПАМОЖА ГОМЕЛЬ

## Маштабная пляцоўка міжнароднага супрацоўніцтва і інвестыцый



XIX Гомельскі эканамічны форум у чарговы раз пацвердзіў свой статус адной з найбольш важных міжнародных дзелавых падзей паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі.

### ЭФЕКТЫЎНАЯ КАМУНІКАЦЫЯ І ПАШЫРЭННЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Форум традыцыйна стаў галоўнай камунікатыўнай пляцоўкай для прадстаўнікоў дзелавых і палітычных колаў з розных краін. Праграму мерапрыемства распрацавалі так, каб максімальна поўна раскрыць патэнцыял вобласці і забяспечыць эфектыўную камунікацыю паміж усімі ўдзельнікамі. Сёлета форум сабраў каля 500 удзельнікаў — прадстаўнікоў 16 замежных дэлегацый: кіраўнікоў дыпмісій, міжнародных арганізацый, органаў дзяржаўнага кіравання і, вядома, бізнесу, зацікаўленага ў пашырэнні партнёрскіх сувязяў.

На пленарнай частцы ад імя беларускіх парламентарыяў удзельнікаў XIX Гомельскага эканамічнага форуму прывітаў **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ.** Ён падкрэсліў гатоўнасць парламента Беларусі садзейнічаць у рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў на найвышэйшым, высокім і міжрэгіянальным узроўнях.

— Савет Рэспублікі прымае самы непасрэдны ўдзел ва ўзмацненні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Работа вядзецца па лініі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Так, з нашымі калегамі з Савета Федэрацыі мы сфарміравалі Міжпарламенцкую камісію, на пасяджэннях якой абмяркоўваем шырокі спектр пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння. З 2014 года праводзіцца Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Запатрабаванасць міжпарламенцкага і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва пацвярджаецца і традыцыйным беларуска-ўзбекскім бізнес-форумам, — звярнуў увагу спікер.

У першы дзень форуму ў палацы Румянцавых і Паскевічаў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** сустрэўся з кіраўнікамі дыпламатычных місій і дэлегацый рэгіёнаў-партнёраў.

— Сёння, калі свет імкліва мяняецца, асабліва важна бачыць адзін у адным не сапернікаў, а партнёраў, не канкурэнтаў, а сяброў. Міжнародная сітуацыя ў апошнія гады развіваецца няпроста. Мы ўсе становімся сведкамі таго, як на змену аднапалярнаму свету, дзе рашэнні дыктуюць, прыходзіць шматпалярная сістэма, дзе цэняцца раўнапраўе і павага. Беларусь і Расія ў саюзе з нашымі партнёрамі паказваюць, што супрацоўніцтва, заснаванае на даверы і ўзаемнай падтрымцы, дае добры плён, — звярнуў увагу Іван Крупко.

Старшыня аблвыканкама асабліва падкрэсліў, што сёння наша краіна — актыўны ігрок на міжнароднай арэне, які прапаноўвае не толькі прадукцыю, але і тэхналогіі, адукацыйныя праграмы, культурныя абмены. І такі шырокі спектр кірункаў міжнародага супрацоўніцтва — характэрная рыса знешняй палітыкі нашай дзяржавы.

Таксама Іван Крупко і **міністр эканомікі і турызму Аўтаномнага краю Ваяводзіна Рэспублікі Сербія Ненад ІВАНІШЭВІЧ** падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і культурнай сферах, а таксама план мерапрыемстваў (дарожную карту) на 2025–2026 гады.

— Мы працягваем і ўмацоўваем тое, што распачата некалькі гадоў таму. Гэта дае надзею на яшчэ больш плённае і якаснае супрацоўніцтва ў эканоміцы, культуры, спорце, — звярнуў увагу Ненад Іванішэвіч.



### НОВЫЯ КАНТАКТЫ, СВЕЖЫЯ ІДЭІ, СУМЕСНЫЯ РАШЭННІ...

У прывітальным слове да ўдзельнікаў форуму Іван Крупко засяродзіў увагу на грунтоўнай рабоце, праведзенай з моманту заснавання Гомельскага эканамічнага форуму. Так, за гады яго правядзення падпісана 117 дакументаў на суму больш за 2,7 млрд долараў, створана звыш 3 тысяч працоўных месцаў, прычым не толькі ў буйных гарадах Гомельшчыны, але і ў аддаленых ад абласнога цэнтра раёнах. За апошнія пяць гадоў у эканоміку Гомельшчыны прыцягнута 3 млрд долараў, 60 % з якіх — інвестыцыі з Расійскай Федэрацыі. У інвестыцыйным каталогу гэтага года — каля 70 прапаноў, 95 аб'ектаў нерухомай маёмасці і больш як 110 зямельных участкаў.

— Больш за 20 гадоў таму ў Гомелі было прынята прагрэсіўнае рашэнне правесці прэзентацыю інавацыйных і інвестыцыйных прапаноў з асабістым удзелам патэнцыяльных інвестараў. Сёння мы з упэўненасцю можам казаць, што Гомельскі эканамічны форум мае статус галоўнай дзелавой падзеі вобласці, — запэўніў губернатар.

Старшыня аблвыканкама падкрэсліў, што сёння сусветны вопыт даказвае — менавіта такія пляцоўкі становяцца каталізатарам эканамічнага росту.

Асаблівая ўвага ў рамках форуму была ўдзелена супрацоўніцтву з Кітайскай Народнай Рэспублікай, якая прадставіла на Гомельскай пляцоўцы свае інвестыцыйныя магчымасці. Намеры аб супрацоўніцтве зацвердзілі подпісамі Гомельскі гарвыканкам і Народны ўрад горада Чанчунь кітайскай правінцыі Цзілінь па пашырэнні і паглыбленні доўгатэрміновага супрацоўніцтва ў сферы эканомікі, гандлю, навукі, тэхналогій і іншых сфер.

Традыцыйна важны блок — супрацоўніцтва з расійскімі партнёрамі. Удзел у форуме прымаюць дэлегацыі з Бранскай вобласці, Алтайскага краю, Чалябінскай і Ніжагародскай абласцей.

— У аснове нашага супрацоўніцтва — прынцыпы ўзаемапавагі, шматвекавая сумесная гісторыя, пераемнасць агульнамаральных і духоўных каштоўнасцяў. На аснове ўзаемаразумення будуецца наша супрацоўніцтва ва ўсіх сферах: эканоміцы, навуцы, культуры, адукацыі і сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, — нагадаў **часова выконваючы абавязкі намесніка губернатара Бранскай вобласці Дзяніс АМЕЛІЧАЎ.**

Адной з галоўных асаблівасцяў Гомельскага форуму стала магчымасць практычнага азнаямлення з эканамічным патэнцыялам рэгіёна. Арганізатары падрыхтавалі для ўдзельнікаў экскурсійныя праграмы з наведваннем прадпрыемстваў рэгіёна. Прадугледжана таксама правядзенне двухбаковых перагавораў у фармаце B2B па заяўках удзельнікаў.

У цэлым праграма форуму сёлета прапануе ўдзел у чатырох тэматычных сесіях, прысвечаных развіццю прамысловасці і лічбавізацыі, турыстычнай індустрыі, бізнес-інструментам і фінансавай падтрымцы бізнесу. Асаблівая ўвага была на адной з секцый — абмеркаванне Стратэгіі ўстойлівага развіцця Гомельскай вобласці да 2040 года, дакумента, падрыхтаванага сумесна з экспертамі і зацікаўленымі бакамі на працягу бягучага года.

Акрамя таго, на форуме прэзентавана выстаўка «Прамысловасць. Навука. Тэхналогіі», дзе найбольш шырока прадстаўлены прамысловы, будаўнічы і сельскагаспадарчы патэнцыялы Гомельшчыны.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**


## РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

извещает о проведении 07.10.2025 электронных торгов по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства в модуле электронной торговой площадки (ЭТП)

Лот № 1. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708166410 (назначение – Квартира, наименование – Квартира № 5), площадью – 123,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лазо, 16А-5.
**Начальная цена продажи – 330 480,00 бел. рублей, задаток – 33 048,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
Постановлением управления Департамента финансовых расследований Комитета государственного контроля Республики Беларусь по Минской области и городу Минску от 11.05.2023 № б/н наложен арест на имущество, постановлением инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Заводскому району г. Минска от 29.05.2024 № 103309 наложен арест на имущество. Хранитель – Близнюк Олег Михайлович, исполняющий обязанности директора ООО «Сунива» (+37529 6311965).

1. Победитель электронных торгов либо в случае, если заявление на участие в торгах подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение электронных торгов и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов. Указанный срок перечисления денежных средств победителем торгов может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен подразделением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 рабочих дней.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя торгов. Организация и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок (Регламент) проведения электронных торгов указан на сайте https://torgikonfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 07.10.2025 в 15.00**
в модуле электронной торговой площадки (ЭТП)
РУП «Торговый дом «Восточный»
(https://torgikonfiskat.by)

Представление заявления на участие в электронных торгах осуществляется после размещения объявления (извещения) о предстоящих электронных торгах в модуле ЭТП. Для участия в электронных торгах заявителю, желающему принять участие, необходимо зарегистрироваться в качестве участника. Регистрация участников электронных торгов производится посредством:

ознакомления с порядком проведения электронных торгов (Регламентом);

перечисления задатка на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот № 1, проводимом **07 октября 2025 года;**

подачи заявления с использованием функциональных возможностей модуля ЭТП.

К заявлению прикладывается изображение документов, подтверждающих перечисление задатка.

**Окончание приема заявлений – 02.10.2025 в 15.00.**

Торги проводятся с 9.00 до 21.00 в рабочие дни.

В ходе электронных торгов любой участник имеет право на новое ценовое предложение, которое должно превысить предыдущее предложение. Величина первого шага составляет 5 (пять) процентов от начальной цены выставленного на электронные торги лота. Все последующие шаги производятся участниками путем увеличения последней предложенной цены. Величина каждого шага составляет 5 (пять) процентов от предыдущей цены лота. Возможность делать ставку предоставляется участникам с использованием функциональных возможностей ЭТП. В течение 10 (десяти) минут со времени начала электронных торгов участникам предлагается внести предложение о приобретении предмета электронных торгов по начальной цене, повышенной на величину первого шага электронных торгов. В случае, если в течение указанного времени:

внесено предложение о приобретении предмета электронных торгов по начальной цене, повышенной на величину первого шага электронных торгов, то время для внесения следующих предложений об увеличенной на шаг электронных торгов цене предмета электронных торгов продлевается на 10 (десять) минут со времени внесения указанного и каждого следующего предложения. Если в течение 10 (десяти) минут после внесения очередного предложения следующее предложение не внесено, электронные торги завершаются;

не внесено ни одного предложения о приобретении предмета электронных торгов по начальной цене предмета электронных торгов, повышенной на величину первого шага электронных торгов, то электронные торги завершаются.

Участник может отозвать заявление на участие в электронных торгах до 12 (двенадцати) часов рабочего дня, предшествующего дню проведения электронных торгов.

**Электронные торги до их начала могут быть перенесены на более поздний срок, отменены, а также лот (его часть) может быть снят с торгов только по письменному указанию Департамента (подразделения Департамента) по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в случае, если проведение конкретных электронных торгов противоречит действующему законодательству Республики Беларусь.**

**Контакты организатора аукциона:**
**+375 44 763 62 63; +375 17 275 75 12.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона**
Адрес: г. Лида, ул. Мопровская, 4

| № лота | Наименование | Инвент. № | Начальная цена лота с НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок по облицов. поверхн. FRIZ RU 15/30 | 00000132 | 14345,04 |
| 2 | Станок для оклейки кромок HOMAG OPTIMAT | 00000172 | 21254,53 |
| 3 | Линия обрезки мебельных щитов HOMAG FPL | 00000175 | 29515,89 |
| 4 | Станок для искусственного старения | 00000286 | 11190,71 |
| 5 | Станок многошпиндельный CB MAGGI ENGINEERING BS 21 | 0287 | 3980,80 |
| 6 | Станок форматно-обрезной ALTENDORF | 042425 | 5783,28 |
| 7 | Обрабат. центр с ЧПУ ROVER S 1/30K3-BIESSE | 042496 | 29065,26 |
| 8 | Станок для попереч. раскроя и оптимизации DIMTER | 042522 | 41382,19 |
| 9 | Линия сращивания по длине GRECON PROFIJOINT | 042523 | 22606,39 |
| 10 | Станок четырехстор. продольно-фрез. VARIOMAT | 042524 | 40480,95 |
| 11 | Шлиф. станок BUTFERING OPTIMAT SWO 313 R | 042525 | 20203,10 |
| 12 | Пресс для склейки щита по ширине POLZER HYDROTEC | 042526 | 20503,50 |
| 13 | Форматно-обрезной круглопил. станок ALTENDORF | 042527 | 5032,24 |
| 14 | Универ. заточной станок RS 2000 | 042535 | 5482,86 |
| 15 | Полуавтомат. токарно-копир. станок с функцией фрезеровки | 042617 | 11040,49 |
| 16 | Автомат. сверлильно-пазовальный центр | 042640 | 10740,10 |
| 17 | Автомат. кромкообл. станок мод. OLIMPIC K400E | 042641 | 6984,92 |
| 18 | Универсал. шипорезный станок | 042642 | 10439,67 |
| 19 | Универс. пазов. станок с двумя рабочими столами | 042643 | 4431,42 |
| 20 | Универс. фрезерно-свер. обрабатыв. центр с ЧПУ | 042644 | 28464,44 |
| 21 | Полуавтоматич. шипорезный станок PADE TF с двумя столами | 042665 | 10439,67 |
| 22 | Сверлильно-пазовальный станок PADE MO с двумя рабочими столами | 042666 | 4431,41 |
| 23 | Строгальный станок Weinig Unimat U17N б/у | 042696 | 11941,74 |
| 24 | Станок круглоп. DMUB 40/320 | 042714 | 5032,24 |
| 25 | Станок Софтформинг-Оптимат K-79/E12/53 | 00000546 | 8186,58 |
| 26 | Обрабат. центр с ЧПУ ROVER B 7.40 R FT, BIESSE | 10037 | 47690,85 |
| 27 | Станок калибровально-шлиф. мод.S219R/KRTБ/У | 10067 | 21554,94 |
| 28 | Швейная машина Brother-S-7200c-405/PFL /01410/ | 10179 | 496,00 |
| 29 | Швейная машина Brother-S-7200c-405/PFL /01411/ | 10180 | 496,00 |
| 30 | Одностор. кромкооблиц. станок для нанесения и обработки плоской кромки в рулонах (меламин, ПВХ, ABS, шпон) и в полосах массив дерева, пластик и т. п.) мод. STREAM A/5.0 - BIESSEEEDGE | 2474 | 57904,90 |
| 34 | Универсально-заточ. станок 3Д642E (кл. т. П) | 042283 | 3079,55 |

Цена снижена на 60 %.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.08.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.10.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие принимаются по 01.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**


# АСНОВЫ ПРАФЕСІЙ — СА ШКОЛЫ

## ДЛЯ БУДУЧЫХ ПРАГРАМІСТАЎ І НЕ ТОЛЬКІ

Аб'яднанні па інтарэсах тэхнічнага, прыродазнаўча-матэматычнага, спартыўна-тэхнічнага профілю функцыянуюць у краіне ў сямі цэнтрах тэхнічнай творчасці, а таксама ў 150 шматпрофільных установах дадатковай адукацыі і складаюць каля 10 % ад агульнай колькасці аб'яднанняў па інтарэсах па ўсіх профілях. Ва ўстановах агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі арганізавана работа 7 490 аб'яднанняў па інтарэсах тэхнічнай накіраванасці, дзе займаецца каля 87 тысяч школьнікаў.

Акрамя таго, для фарміравання ў дзяцей і падлеткаў інжынерна-тэхнічнага мыслення і прыцягнення іх у тэхнічную творчасць і даследчую дзейнасць ва ўсіх рэгіёнах краіны на пачатак навучальнага года функцыянуе 178 інжынерна-тэхнічных цэнтраў на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У іх займаецца каля 13 тысяч навучэнцаў. Там праводзяцца не толькі факультатыўныя заняткі, але і падрыхтоўка для алімпіяд, навукова-практычных канферэнцый, у тым ліку для паступлення на адукацыйныя змены ў Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк.

Як адзначыла **намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка Наталля ЛЕПЕСІЙ**, установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама інжынерна-тэхнічныя цэнтры на сёння з'яўляюцца паўнапраўнымі ўдзельнікамі кластэра па рабоце з адоранай моладдзю, цэнтральным звяном якога выступае Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. У ім рэалізуецца праграма адукацыі адораных дзяцей і моладзі па 15 прыярытэтных для краіны кірунках навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. Змест праграм пастаянна абнаўляецца з улікам развіцця прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі, а складаюцца яны пры садзейнічанні ВНУ, Нацыянальнай акадэміі навук, прадпрыемстваў і навуковых арганізацый.

У гэтым навучальным годзе ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку будзе рэалізавана 14 новых навучальных праграм для адораных дзяцей і моладзі. Усяго ж тут сёлета адкрыта звыш 70 аб'яднанняў па інтарэсах. Традыцыйна попыт на тэхнічныя і інжынерныя навучальныя праграмы вельмі высокі і дазваляе камплектаваць вучэбныя групы матываванымі і зацікаўленымі дзецьмі і падлеткамі, якія затым могуць паступаць на адукацыйныя змены ў Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк.

Для навучэнцаў аб'яднанняў па інтарэсах праводзіцца шэраг конкурсаў. Сёлета ў лістападзе ўпершыню пройдзе рэспубліканскі конкурс на найлепшы праект навучэнцаў інжынерна-тэхнічных цэнтраў.

— Школьнікі, якія займаюцца ў інжынерна-тэхнічных цэнтрах, што працуюць на базе звычайных школ, распрацоўваюць на факультатыўных занятках і ў аб'яднаннях па інтарэсах праекты па кірунках, якія карэлююць з навучаннем ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку. Гэта праекты па робататэхніцы, інфармацыйных і камп'ютарных тэхналогіях, інжынерна-тэхнічнай, хіміка-біялагічнай накіраванасці. Таму хлопцы і дзяўчаты маюць магчымасць паўдзельнічаць у рэспубліканскім конкурсе, — расказала Наталля Лепесій, дадаўшы, што абавязкова будуць задзейнічаны прадпрыемствы рэальнага сектара эканомікі, якія ў далейшым змогуць матываваць дзяцей на развіццё тэхнічнай творчасці. Конкурс пройдзе паэтапна — спачатку ў раёне, потым у вобласці, фінал адбудзецца ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку ў канцы лістапада.









## ШТО ПАТРЭБНА ДЗЯРЖАВЕ?

Наталля Лепесій нагадала, што, згодна з рашэннем, прынятым на нарадзе з удзелам Прэм'ер-міністра краіны аб якасці падрыхтоўкі інжынерных кадраў, якая адбылася ў снежні мінулага года, перад установамі дадатковай адукацыі стаіць задача павысіць якасць прафарыентацыйнай работы для фарміравання ў навучэнцаў матывацыі да атрымання інжынерных спецыяльнасцяў. Акрамя таго, міністрам адукацыі вызначаны новыя прыярытэты развіцця сістэмы дадатковай адукацыі. У прыватнасці, да 2030 года неабходна павялічыць ахоп навучэнцаў, занятых тэхнічнай творчасцю, да 25 % ад агульнай колькасці тых, што атрымліваюць дадатковую адукацыю.

## ДЛЯ ТВОРЧЫХ І КРЭАТЫЎНЫХ

Найбольш папулярнымі ў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі застаюцца гурткі мастацкага профілю. Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі не толькі каардынуе дзейнасць устаноў дадатковай адукацыі і арганізацыю мерапрыемстваў рэспубліканскага ўзроўню, але і забяспечвае работу аб'яднанняў па інтарэсах.

— Адным з найбольш папулярных кірункаў застаецца мастацкі профіль. Творчыя гурткі, студыі прыцягваюць дзяцей, якія жадаюць займацца музыкай, жывапісам, тэатрам і танцамі. Гэтыя заняткі не толькі развіваюць мастацкія здольнасці, але і спрыяюць фарміраванню ўпэўненасці ў сабе, уменню працаваць у камандзе і выказваць свае думкі. Мастацкае выхаванне развівае пачуццё прыгожага, фарміруе светапогляд і крэатыўныя якасці асобы, служыць матывацыяй да любой творчай, стваральнай дзейнасці. Ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі актыўна працуюць гурткі і студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці і выяўленчага мастацтва, — расказала **намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Ганна АВЕРЫНА**.

Яна дадала, што ў цэнтры таксама з'яўляюцца новыя кірункі, звязаныя з дызайнам, анімацыяй, дзіцячай журналістыкай і блогерствам, модай і мадэлінгам. Запіс у большасць гурткоў і студый працягваецца — педагогі з радасцю чакаюць усіх ахвотных.

**Фота Лізаветы ГОЛАД і Віктара ДРАЧОВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СВЕЖАЕ І ЯКАСНАЕ ПА ДАСТУПНАЙ ЦАНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У сталіцы сезон сельскагаспадарчых кірмашоў мяркуецца скончыць 7 снежня, калі надвор'е будзе гэтаму спрыяць. Сёлета асноўнай лакацыяй у Мінску застаецца «Чыжоўка-арэна». Побач з Палацам спорту плануецца правядзенне кірмашоў на працягу ўсяго некалькіх выхадных — 20 і 21 верасня, а таксама аднойчы ў кастрычніку і лістападзе. Арганізавана гэта лакацыя для жыхароў Цэнтральнага раёна сталіцы, якім далёка ехаць да асноўнай раённай пляцоўкі.

Зрэшты, па некалькі пляцовак для кірмашоў прадугледжаны ў кожным раёне Мінска. Іх адрасы і графікі работы размешчаны на сайтах раённых адміністрацый і Мінгарвыканкама. Кірмаш на «Чыжоўцы-арэне» будзе працаваць кожныя выхадныя з 8 да 16-17 гадзін, у астатніх раёнах —пераважна з 10 да 16-17 гадзін.

Асноўны акцэнт будзе зроблены на свежую айчынную плодаагароднінную прадукцыю. Шырокі асартымент прадставяць прадпрыемствы «Белкаапсаюза», рыбныя гаспадаркі, вытворцы мясной і малочнай прадукцыі.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

— Пачынаючы з вясны, пытанне з бульбай было на асаблівым кантролі. Улічваючы, што фермеры і іншыя вытворцы значна павялічылі пасяўныя плошчы пад гэту культуру і той факт, што сёлета ўраджайнасць дастаткова добрая, вялікі выбар розных сартоў бульбы будзе прадстаўлены на сельскагаспадарчых кірмашах, — падкрэсліла **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ**.

У Мінскай вобласці з 20 верасня таксама пачнуць сваю работу сезонныя кірмашы, праходзіць яны будуць да 1 лістапада. Іх запланавана каля сотні. Гэта як кірмашы выхаднога дня ў гарадах, райцэнтрах і аграгарадках вобласці, так і буйныя рэгіянальныя кірмашы з самым шырокім асартыментам. 4 кастрычніка такія рэгіянальныя кірмашы пройдуць у Барысаве, Бараўлянах і Маладзечне, 5 кастрычніка — у Нясвіжы, 11 кастрычніка — у Вілейцы і Салігорску, 18 кастрычніка — у Жодзіне і Слуцку. Працаваць яны будуць з 10 да 16-17 гадзін.



У месцах правядзення кірмашоў плануюцца культурна-забаўляльныя мерапрыемствы з выступленнямі творчых калектываў і інтэрактывамі для дзяцей. Усюды будзе арганізавана аказанне дапамогі па дастаўцы прадукцыі ветэранам вайны, адзінокім пажылым людзям, інвалідам 1-й і 2-й груп. Яе будуць ажыццяўляць валанцёры — яны даставяць усё неабходнае як да дому, так і да транспартнага сродку.

— З улікам добрага ўраджаю і вялікай колькасці сельгасвытворцаў, мяркую, кірмашы будуць карыстацца попытам як у жыхароў рэгіёна, так і ў мінчан, — рэзюмавала **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінскага аблвыканкама Наталля СУЙКОВА**.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
***проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности***
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-156718, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 16. Площадь: 964,7 кв. м. Наименование: Склад для хранения химических и других материалов. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада для хранения химических и других материалов с четырьмя навесами 1, 2, 3, 4. Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 600/С-149365, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/2, район аг. Колодищи. Площадь: 548,6 кв. м. Наименование: Склад металлоизделий с участком комплектации. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада металлоизделий с участком комплектации. Обременение: аренда. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **934 000,00** | **Задаток, BYN** | **93 400,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ» Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99 E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 06 октября 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **07 октября 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона



УНП 192955293

**ООО «Вельми Смачна»**
информирует покупателей (потребителей)
ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ВОЗВРАТА
**кондитерских изделий изготовителя ООО «Слакон»,**
Россия, г. Москва, ул. Авиамоторная, 50, строение 2, офис 8;
адрес производства: Россия, Курганская обл., г. Шадринск, ул. Ломоносова, 2, строение 1.

Возврат можно осуществить в месте приобретения продукции.

# ПАГРАНІЧНЫ СТАН ЕЎРАСАЮЗА?

## Польшча закрыла сухапутны калідор для тавараў для ўсяго ЕС: Брусель маўчыць

**Магчыма, я прапусціў нейкія навіны? Еўрасаюз яшчэ жывы? Несумненна, чыноўнікі ў Брусэлі засталіся ў сваіх крэслах, атрымліваюць зарплату і выказваюць традыцыйныя занепакоенасці і заклапочанасці. Але ці існуе ЕС як адзіная эканамічная і мытная прастора?! Прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Польшчы Павел Уроньскі шчыра заявіў: Варшава прыняла самастойнае рашэнне па закрыцці граніцы з Беларуссю. Без кансультацый. Ні з намі, Кітаем ці іншымі далёкімі краінамі, якіх у той ці іншай ступені закранае гэта рашэнне, ні з Брусэлем і суседзямі па ЕС, якія таксама знаходзяцца на гэтым трансгранічным лагістычным канале. Дык Еўропа яшчэ адзіная ці ўжо пачынае ператварацца ў пазл?!**

Пытанне насамрэч не трывіяльнае, а нават вельмі сур'ёзнае. У нейкай ступені гістарычнае з геапалітычнага пункту гледжання. Бо якая цікавая гісторыя вымалёўваецца! Вельмі нечакана (у тым ліку, для сваіх грамадзян і бізнесу) Варшава адчула вострую небяспеку ад вучэнняў «Захад-2025». Паніка і выбар нагоды для гэтага — суверэннае права любой дзяржавы. Толькі вось аб вучэннях было вядома доўгія-доўгія месяцы. І экзістэнцыйнай небяспекі ні польскія вайскоўцы, ні іх калегі па НАТА, ні іх прыбалтыйскія суседзі не заўважалі. Але раптам наспела рашэнне — спыніць усялякі рух праз граніцу. Прычым закрыццё прапускных пунктаў надыходзіла праз 50 гадзін! Далей — больш: вучэнне паспяхова скончылася, а граніца з польскага боку так і засталася на замку. Сотні фур польскіх перавозчыкаў затрымаліся на нашай тэрыторыі, і яны не зусім разумеюць, як цяпер вярнуцца на радзіму самім і вярнуць тэхніку. Нават сваіх не пашкадавалі. Быццам бы абяцалі пакрыць выдаткі бізнесу, але потым, калі-небудзь, і калі будуць падлічаны ўсе страты...

Але справа ў тым, што Варшава пайшла на абвастрэнне аднабакова. Нават без кансультацый ні ў рамках Еўрасаюза, ні з краінамі, якія зацікаўлены ў міжнародным транспартным калідоры, які праходзіць з Азіі ў Еўропу праз Беларусь. А пастаўкі ж сарваліся і ў нямецкіх атрымальнікаў грузаў, і ў галандскіх, бельгійскіх... Нават на партнёраў па Еўрасаюзе напляваліі! Прычым Брусель неяк не вельмі і абураецца. Атрымліваецца, што так можна?




Фота БелТА.

Так сабе прэцэдэнт. Еўропа дастаткова вялікая, каб па яе граніцах маглі ў тых ці іншых дзяржаў узнікаць асцярогі, сумневы, боязь. Асабліва ва ўмовах, калі ўвесь свет схільны да мілітарызацыі, а гарачыя кропкі мінулага працягваюць тлець і разгарацца, ды яшчэ ўзнікаюць шматлікія новыя канфлікты. Міграцыйных рызык і пагроз хапае з усіх бакоў. І Міжземнамор'е, і Балканы працягваюць заставацца ключавымі каналамі пранікнення з Паўночнай Афрыкі і іншых рэгіёнаў у Еўропу. Але нават у самыя драматычныя часы крызісу, звязанага з сірыйскімі бежанцамі ў сярэдзіне 2010-х, рух тавараў не спыняўся. А тады ж у ЕС з Блізкага Усходу ішлі караваны з дзясяткаў і сотняў тысяч бежанцаў.

Атрымліваецца, што граніцы Еўрасаюза перасталі падпарадкоўвацца ўніверсальным правілам функцыянавання? Несумненна, нарматыўна-прававая база дае магчымасць уводзіць нацыянальныя абмежаванні. Але гэтай магчымасцю неяк не прынята карыстацца. Тым больш што асабліва важкіх падстаў для правакавання лагістычнага крызісу не было. Тым больш што Латвія і Літва на экстраныя меры не ішлі. Заявілі толькі, што гатовы гэта зрабіць у любы момант з-за непрадбачаных падзей. Што ж, пагранічная служба любой краіны павінна быць гатовай да неадкладнай рэакцыі на нейкую надзвычайную сітуацыю. Але нават у Вільнюсе і Рызе не палічылі цяперашнюю сітуацыю нейкай празмерна пагрозлівай.

Паўтаруся: пагранічны інцыдэнт можа мець сур'ёзныя геапалітычныя наступствы. Па-першае, аказалася, што калі вельмі захацець, то любая краіна з ЕС можа рабіць нешта без аглядкі на еўрадыпламатыю, на суседзяў, на працэдуры. Адсюль узнікае пытанне: наколькі існуюць адзіныя падыходы ў Еўрасаюзе? І ці ёсць глыбокі сэнс весці нейкі дыялог з Брусэлем? Прынамсі, па значных пытаннях.

Па-другое, закрыццё граніцы б'е па еўрапейскіх узаемаадносінах з Кітаем, які па-ранейшаму з'яўляецца важным гандлёвым партнёрам усёй Еўропы. Здаецца, аб'яднанай. Адпаведна, і адказнасць эканамічная можа наступіць салідарная. Тым больш не будзем забывацца: цяпер не толькі Вашынгтон перазагружае гандлёвыя ўзаемаадносіны з Пекінам. Падобны працэс, але менш яскравы і публічны, адбываецца і па лініі ЕС — КНР. І варшаўскі дэмарш можа вельмі моцна пашкодзіць гэтым перагаворам.

Па-трэцяе, эскалацыя неяк вельмі выразна кладзецца ў іншы трэк — патрабаванне Вашынгтона ад ЕС адмовіцца цалкам ад расійскіх нафты і газу. Кажучы прасцей — перайсці на амерыканскія энерганосьбіты. Дональд Трамп вельмі актыўна і безапеляцыйна праціскае ў Старым Свеце эканамічныя інтарэсы ЗША. І паслабленне геаэканамічных сувязяў ЕС з КНР у прыватнасці і Паўднёва-Усходняй Азіяй у цэлым — лагічная палітыка Штатаў для паслаблення еўрапейскага і азіяцкага эканамічных цэнтраў. Тады з імі будзе зручней дамаўляцца паасобку.

Заканчэнне гэтай пагранічнай гісторыі пакуль незразумелае і невідавочнае. Але ўжо, безумоўна, бачна: пад вялікае пытанне пастаўлена эканамічнае адзінства Еўропы. Несумненна, заўсёды кожны з членаў ЕС спрабаваў іграць сваю мелодыю і навязваць яе астатнім. Але ў рамках еўрапейскага канцэрта неяк атрымлівалася знаходзіць агульную танальнасць, каб яна не рэзала слых знешняму слухачу. Апошняя гісторыя з Варшавай ужо сур'ёзна прымушае засумнявацца ў адзінстве Еўропы. Не па духу, але па эканамічнай палітыцы. І ці ёсць сэнс сёння аб нечым дамаўляцца з Брусэлем, калі прынцыповыя пытанні могуць вырашацца на ўзроўні нацыянальных сталіц?

**Аляксей КЛІМАЎ.**


**Центр Промышленной Оценки**

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

**Лот № 1**
**Адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 33, 33/4**

**Участок раскроя плитных и листовых материалов (Д 3-4/К-КП)** (**4 693,0 кв. м,** 500/С-31921), **тепловые сети** (500/С-13017974, 126,5 м). ***Оборудование, входящее в состав лота***: **трансформатор** (инв. № 00000316), **трансформатор силовой** (инв. № 00000320), **оборудование ТП** (инв. № 00000332)

***Обременение:*** площади здания частично сданы в аренду 1480,59 кв. м)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 9 544 320,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 2**
**Адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 33**

**Ремонтно-механические мастерские** (**1053.0 кв. м,** 500/С-23110)

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 456 000,00 бел. руб.** (снижена на 10 %)

